# УКЛАД ПРАФЕСАРА Т. І. ДОЎНАР У РАЗВІЦЦЁ ГІСТОРЫКА-ПРАВАВОЙ НАВУКІ БЕЛАРУСІ

**І. А. Саракавік**
*дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*
*Акадэмія кіравання пры ПрэзідэнцеРэспублікі Беларусь, г. Мінск, Беларусь*

Паказаны значны ўклад прафесара Т. І. Доўнар у развіцце гісторыка-прававой навукі.

Показан значительный вклад профессора Т. И. Довнар в развитие историко-правовой науки.

It describes the significant contribution of professor T. Dovnar to the development of the historical and legal science.

Доктар юрыдычных навук, прафесар Доўнар Т. І. – вядомейшы ў Рэспубліцы Беларусь юрыст і безумоўны лідэр айчыннай гісторыка-прававой навукі, які належным чынам пераняў эстафету ад свайго Настаўніка – прафесара І. А. Юхо. Адначасова яна з'яўляецца выдатнейшым педагогам вышэйшай школы, якога вельмі паважаюць калегі і студэнты. Адным словам – Прафесіянал з вялікай літары ў навукова-даследчай і выкладчыцкай дзейнасці, знакавая асоба навукі Беларусі, які заўсёды застаецца патрыётам роднай Бацькаўшчыны.

Калі падыйсці аб'ектыўна да яе працы, то перш за ўсё трэба ўлічыць усе тыя шматлікія фактары, што ўплываюць на паводзіны людзей. Большасць даследчыкаў і практыкаў прыйшлі да высновы ацэньваць асобу і яе дзеянні з пункту гледжання таго, што яна рэальна здзейсніла ў духоўнай ці матэрыяльнай сферы, чым яна кіравалася пры гэтым і якія яе маральныя якасці.

Адданасць праф. Доўнар Т. І. сваёй Радзіме бачна найперш па яе навуковых, вучэбных і вучэбна-метадычных працах, у якіх яна адстойвае беларускую дзяржаўнасць і беларускае права на ўсіх гістарычных этапах іх развіцця. Патрэбна адзначыць, што на гэту адданасць Беларусі вельмі паўплывалі бацькі, вучоба ў школе, а потым на юрыдычным факультэце БДУ. Ёй, як і яе аднакурснікам, пашчасціла слухаць лекцыі вядомейшых выкладчыкаў-спецыялістаў розных галін права. Асаблівай павагі студэнтаў выклікалі сваім прафесіяналізмам, эрудыцыяй і дэмакратычнасцю адносін прафесары, якія прайшлі вайну, – А. А. Галаўко, С. Г. Драбязка, А. В. Дулаў, У. Ф. Чыгір, М. Р. Юркевіч,

І. А. Юхо. Як пазначае сама праф. Доўнар Т. І., у часы студэнцтва асаблівы ўплыў на многіх студэнтаў аказвалі лекцыі прафесара І. А. Юхо, які чытаў курс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Ён з'яўляўся таленавітым педагогам, які любіў і паважаў моладзь, і ў сваіх лекцыях, навуковых публікацыях імкнуўся абудзіць у кожным студэнце самастойнасць мыслення, актыўную жыццёвую пазіцыю, любоў да роднай Беларусі, сапраўдным патрыётам якой ён быў заўсёды. Наогул, многія выкладчыкі (Ф.І. Гаўзе, В.А. Шкурко, І.І. Марціновіч, Я.А. Мацвіенка, С.П. Бякешка, Л.В. Паўлава, В.Н. Шпілёў, М.М. Гапановіч, І.А. Матусевіч і інш.) выклікалі павагу прафесіяналізмам, прынцыповасцю і самае галоўнае – жаданнем даць добрыя трывалыя веды.

Пасля заканчэння БДУ менавіта іх асабісты прыклад, методыка выкладання вучэбнага матэрыялу стала асновай выкладчыцкай дзейнасці маладога тады выкладчыка. Тым больш, што яе цяга да навукі і аналітычныя здольнасці заўважыў І. А. Юхо. Адначасова з работай у якасці выкладчыка кафедры гісторыі дзяржавы і права і выкладаннем студэнтам гісторыка-прававых дысцыплін Т.І.Доўнар стала працаваць над кандыдацкай дысертацыяй, тэму якой - "Гісторыя Канстытуцыі БССР" прапанаванаў навуковы кіраўнік праф. Юхо І. А. Саіскальніца навуковай ступені праявіла самастойнасць, асэнсаваўшы сутнасць тэмы і адпаведную літаратуру, удакладніла яе ў тэарэтыка-прававым аспекце - "Пераемнасць у канстытуцыйным будаўніцтве БССР". Аб навуковым узроўні дысертацыі сведчыць той факт, што яна паспяхова была абаронена ў Ленінградскім дзяржаўным універсітэце, вядомым сваімі навуковымі традыцыямі і дасягненнямі, сваёй адметнай юрыдычнай школай.

Паспяховай навукова-педагагічнай працы Т.І. Доўнар садзейнічала творчая, добразычлівая атмасфера ў калектыве, якую стваралі вядомыя даследчыкі з вялікім жыццёвым вопытам: загадчык кафедры прафесар С. Г. Драбязка, старшыя калегі і асабліва І. А. Юхо. Яны прыўносілі ў калектыў дух высокага прафесіяналізму, дружбы, узаемадзеяння, дэмакратызму ў адносінах да студэнтаў. На яе погляд, прафесар І. А. Юхо пры дыскусіях і спрэчках, якія часам узнікалі не толькі па прававых і вучэбна-метадычных пытаннях, але і жыццёвых праблемах, будучы вельмі тактычнай асобай, імкнуўся згладжваць супрацьлеглыя думкі, прыводзіў адпаведна канкрэтным пытанням філасофскія і біблейскія прытчы.

Маладых выкладчыкаў часам прыцягвалі да буйных навуковых прац. У сувязі з тым, што дактары юрыдычных навук І.А. Юхо і В.А. Круталевіч даследавалі ў Інстытуце філасофіі і права важную гісторыка-

прававую навуковую тэму, да яе распрацоўкі запрасілі і Т.І. Доўнар. Ёй дасталіся раздзелы па гісторыі права Вялікага Княства Літоўскага. Гэты абумовіла і выбар тэмы доктарскай дысертацыі. У 1997 г. яна паспяхова абараніла ў БДУ доктарскую дысертацыю на тэму: «Развіццё агульназемскага права Беларусі ў XV – XVI стагоддзях». Упершыню ў беларускім правазнаўстве было глыбока, поўна і ўсебакова даследавана станаўленне і развіццё крымінальнага і цывільнага права часоў Вялікага Княства Літоўскага – Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Быў праведзены параўнальны аналіз заканадаўства ВКЛ, найперш трох Статутаў, а таксама праведзена каласальная тэарэтычная праца над першакрыніцамі права XV – XVI стст, на аснове якіх выдадзены манаграфіі, якімі сёння шырока карыстаюцца выкладчыкі і студэнты юрыдычных факультэтаў [1]. Неабходна адзначыць, што амаль што ўпершыню дысертацыйная праца па юрыспрудэнцыі была абронена на беларускай мове.

Разглядаючы здзейсненае прафесарам Т.І. Доўнар у сферы айчыннай гісторыка-прававой навукі бачым, што яна найперш акцэнтавала ўвагу на тых праблемах юрыспрудэнцыі дзяржавы, якія тады існавалі. Акрамя гісторыі прававых інстытутаў і заканадаўства, яна закранала многія іншыя пытанні, якія не былі даследаваны або былі мала даследаваны раней у тым ліку адносна эвалюцыі палітычных інстытутаў, гісторыі беларускага канстытуцыяналізму і парламентарызму, гісторыі айчыннай прававой думкі, узаемаадносін царквы і дзяржавы і інш. [2]. Яна старалася даследаваць магдэбургскае права ў Беларусі як спецыфіку спалучэння мясцовых і агульнадзяржаўных інтарэсаў, закрануць пытанні дзейнасці канкрэтных судовых органаў, узаемадзеяння прававой культуры Беларусі з заходнееўрапейскай культурай, а таксама праблемныя пытанні савецкага перыяду гісторыі дзяржавы і права Беларусі і шмат што іншае. Аб гэтым сведчаць больш за 300 яе навуковых прац, у тым ліку 7 манаграфій, звыш 60 вучэбных дапаможнікаў і вучэбна-метадычных прац і матэрыялаў, першы ў Беларусі вучэбнік па гісторыі дзяржавы і права Беларусі, стварэнне (сумесна з І. А. Юхо) беларускай гісторыка-прававой школы, падрыхтоўка доктара юрыдычных навук і дзевяці кандыдатаў юрыдычных навук і інш.

Аднак праф. Доўнар Т.І. незадаволена як сваімі дасягненнямі, так і ўвогуле становішчам айчыннай гісторыка-прававой навукі, пра што неаднойчы выказвалася ў сваіх выступленнях на навуковых канферэнцыях і ў публікацыях [4]. У параўнанні хаця бы з суседнімі дзяржавамі, стан навукі гісторыі дзяржавы і права Беларусі не можа задаволіць ні грамадства, ні саму дзяржаву. Перш за ўсё таму, што гісторыкаў права ў нас адзінкі. Па-другое, у краіне адсутнічае

акадэмічны цэнтр па даследаванню гісторыі дзяржавы і права Беларусі, а таксама спецыяльныя кафедры ў вышэйшых навучальных установах і шмат інш. Менавіта таму існуюць значныя прабелы ў гісторыка-прававой навуцы і многія пытанні застаюцца не даследаванымі. Так, яна акцэнтуе ўвагу на тым, што даследаванне пытанняў прававой гісторыі мае на ўвазе звяртанне як непасрэдна да прававых нормаў і інстытутаў, так і эканамічных і палітычных працэсаў у грамадстве; а таксама да разгляду прававога становішча насельніцтва, тым больш, што незадаволенасць сялянства была тым актыўным фактарам, які прыкметна ўплывалі на ўвесь гістарычны працэс. Менавіта таму неабходна з новых пазіцый даследаваць зямельныя рэформы, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў XVI, XIX, XX стст. і хоць некалькі палепшалі становішча, але часам і ўскладнялі яго, прыводзілі да сацыяльных выбухаў, паўстанняў, а пасля – і да рэвалюцый. У сучасны момант аграрна-сялянскае пытанне і звязаныя з ім праблемы застаюцца актуальнымі.

Таксама праф. Доўнар Т.І. пазначае, што ў мінулы гістарычны перыяд мала ўвагі звярталася на даследаванне нацыянальна-вызваленчага руху Беларусі. А ён з яго рознымі палітыка-ідэалагічнымі плынямі з’яўляецца істотным і моцным фактарам уздзеяння на ход гістарычнага развіцця. Нацыянальныя рухі аказвалі і аказваюць цяпер значны ўплыў на развіццё дзяржаўнасці і права, на сусветны гістарычны працэс. Тым больш, што з нацыянальным фактарам у многім падобны, а, галоўнае, – узаемазвязаны і часам цесна пераплецены рэлігійны фактар. Сведчаннем таму з’яўляецца ўся сусветная, у тым ліку і беларуская, гісторыя. У раннім Сярэднявеччы, калі на змену паганству на нашых землях прыйшла хрысціянская рэлігія візантыйскага кірунку, рэзка змяніўся менталітэт народу, а разам з гэтым і развіццё прававых адносін у грамадстве і дзяржаве. Затым з XIV ст. прымусовым шляхам уводзіцца заходні кірунак хрысціянства – каталіцызм, а з XVI ст., у перыяд Рэфармацыі, узнікае моцная плынь пратэстанства, а на час контррэфармацыі – уніяцтва. Адметнасцю Беларусі з’яўлялася і тое, што адначасова на яе тэрыторыі дзейнічалі іслам і іудзейскае веравызнанне. Рэлігійны фактар пастаянна значна ўплываў на ўсе грамадскія працэсы, не гледзячы на тое, што ў XVI ст. заканадаўча замацоўваецца прынцып верацярпімасці. Пасля далучэння Беларусі да Расіі адбыліся новыя змены ў светапоглядзе грамадства і народным менталітэце. Гэта ж адбылося і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Менавіта таму пытанні царкоўна-рэлігійнага жыцця беларускага народу, узаемадзеяння рэлігійных канфесій, узаемаадносін царквы і дзяржавы застаюцца актуальнымі і цяпер патрабуюць значнай увагі вучоных [3].

На думку прафесара, аднаму даследчыку нельга ахапіць неахопнае. Сёння вельмі патрэбна, каб па кожнаму кірунку гісторыка-прававой навукі і перыядам гістарычнага развіцця дзяржаўнасці Беларусі былі спецыялісты самага вышэйшага ўзроўню, якія б непасрэдна кіравалі падрыхтоўкай навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі і ў большай ступені займаліся навуковымі даследаваннямі, а не навучаннем студэнтаўТым больш, што зараз існуе пільная патрэбнасць больш актыўнага і сістэмнага даследавання ўсіх кірункаў айчыннай гісторыі, што стане перадумовай для больш дакладных прадстаўленняў пра гістарычную эвалюцыю нацыянальнай дзяржаўнасці і перспектывах айчыннага гісторыка-прававога развіцця..

Сама даследчыца прадаўжае актыўна займацца навукова-педагагічнай дзейнасцю, рыхтаваць новых кандыдатаў юрыдычных навук. Выдатнай з’явай гісторыка-прававой навукі і дысцыпліны стала выданне першага ў Беларусі вучэбніка па гісторыі дзяржавы і права Беларусі [4]. Гэта практычна новае прачытанне дзяржаўнасці і права беларускага, удакладненне яе перыядызацыі з улікам сучасных навуковых падыходаў і дасягненняў, адыход ад ранейшых міфаў і стэрыатыпаў.

Імпануе ў працах прафесара Т.І. Доўнар і тое, што яна аргументавана на высокім навуковым узроўні адстойвае гістарычную праўду, не прыстасоўваецца да, часам, зменлівых палітычных абставін. Правамерна, да прыкладу, яе заўвагі некаторым замежным даследчыкам не толькі ў артыкулах, але і непасрэдна на міжнародных канферэнцыях, якія ў сваіх працах настойліва сцвярджаюць аб існаванні ў сярэднявеччы такога дзяржаўнага ўтварэння, як Літва. Прычым гэта не апіска, не агаворка, а свядомая пазіцыя шэрагу навукоўцаў, хоць добра вядома з прававых і іншых крыніц аб існаванні Вялікага Княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага – дзяржавы, палітыка-эканамічным цэнтрам якой былі беларускія землі. Такім падыходам яны зняважліва ставяцца да беларускага народа, які сумесна з балтамі ўтварыў вялікую і пэўным часам магутную дзяржаву, якая адыгрывала важную ролю ў геапалітыцы Еўропы і распрацавала сусветна вядомыя помнікі права на беларускай мове – Статуты ВКЛ. Прафесар Т. І. Доўнар не праходзіць міма такіх сцвярджэнняў. Для яе, як сапраўднага даследчыка, галоўнае – навуковая ісціна і справядлівасць.

Таісія Іванаўна больш за сорак пяць гадоў працуе ў вышэйшай школе і выкладае гісторыю дзяржавы і права Беларусі ў сваёй альма матар За гэты час яна стала не толькі вядомейшым даследчыкам, але і прафесіянальным, цікавым, добразычлівым да студэнтаў выкладчыкам. Яе гісторыка-прававы кругагляд, багаты жыццёвы вопыт выклікаюць у

студэнтаў павагу да гісторыі ўласнага народа і цікавасць да беларускай дзяржаўнасці і права розных гістарычных перыядаў.

Закранаючы пытанні належнай падрыхтоўкі прафесіяналаў-юрыстаў, прафесар Доўнар Т.І. выказвае меркаванне, што пэўныя аглядкі на Захад, падробкі пад другую сістэму навучання, у працэсе чаго адбываецца састыкоўка выпрацаванай дзесяцігоддзямі ўласнай сістэмы навучання і заходнееўрапейскай, у тым ліку і пераход на чатырохгадовае навучанне ў вну, часам адбіваецца не лепшым чынам на сістэме нацыянальнага навучання, прафесійнай падрыхтоўцы студэнтаў.

Заклапочана прафесар Доўнар і падрыхтоўкай навуковых кадраў, строгім патрабаванне ВАК аб практычнай (эканамічнай) накіраванасці прац суіскальнікаў па гуманітарных навуках. Яна лічыць, што пэўны практычны кірунак навуковых даследаванняў павінен прысутнічаць, але не па ўсіх жа навуковых кірунках, тым больш у сферы гісторыка-прававой навукі. Гістарычныя навукі існуюць перш за ўсё для таго, каб не паўтараць памылкі мінулага, каб чалавечая цывілізацыя ў сваім развіцці не наступала на адны і тыя ж граблі. І ўжо толькі гэта дастаткова для яе існавання. Таму і адносіны да гэтай навукі павінны быць асаблівымі. Тым больш, што павага да мінулага, ушанаванне знакамітых вучоных і дзяржаўных асобаў садзейнічае выхаванню сапраўдных патрыётаў сваёй Айчыны, з’яўляецца асновай распрацоўкі дзяржаўнай ідэалогіі.

Патрэбна адзначыць, што навуковая дзейнасць – гэта вельмі значны, неабходны і патрэбны для кожнай дзяржавы від чалавечай дзейнасці і творчасці. Аднак аб адносінах да юрыдычнай навукі ў цэлым і гісторыка-прававой у прыватнасці сведчыць той факт, што калі ў Нацыянальнай акадэміі Беларусі многія галіны навукі прадстаўлены акадэмікамі, то акадэміка-юрыста пасля смерці ў сярэдзіне 1930-х гг. М.О. Грэдынгера на сёння няма. Адсутнасць акадэміка-юрыста, а таксама акадэміка - гісторыка права наводзіць на думку пра канкрэтныя, спецыфічныя адносіны да юрыдычнай навукі. На наш погляд, калі цяпер мы жывём у суверэннай дзяржаве, да чаго крочылі доўгі час, то павінны ўсялякімі сродкамі клапаціцца ад аўтарытэце нацыянальнай дзяржаўнасці, чаму, безумоўна, будзе садзейнічаць належнае кіраўніцтва распрацоўкай пытанняў гісторыі дзяржавы і права Беларусі, а таксама павелічэнне колькасці і якасці навуковых кадраў самай вышэйшай кваліфікацыі, у тым ліку і акадэмікаў.

Паднятце ўсіх праблемных пытанняў гістарычнага дзяржаўна-прававога развіцця характэрна для ўсёй навуковай творчасці прафесара Доўнар Т. І. Падсумоўваючы яе дасягненні у сферы айчыннай гісторыка-прававой навукі і падрыхтоўкі прафесійных юрыдычных

кадраў, можна з упэўненасцю сказаць, што гэта прыклад і ўзор як належных адносін да працы, так і павагі і любові да роднай Айчыны. Прафесар Доўнар Таіса Іванаўна ўжо сёння пакінула глыбокі след не толькі ў юрыдычнай навуцы Беларусі, але і ў сусветнай навуцы.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Доўнар Т.І. Развіццё асноўных інстытутаў грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў XV – XVI стагоддзях. Манаграфія. Мінск: «Пропилеи», 2000. 224 с.

2. Доўнар Т.І. Зараджэнне і гістарычнае развіццё беларускага канстытуцыяналізму // Конституционно-правовое регулирование общественных отношений в Республике Беларусь и других европейских государствах: сб. науч. ст. / ГрГУ им. Я.Купалы; отв.ред. Н.В.Сильченко. Гродно: ГрГУ, 2011. С.66-70; Доўнар Т.І. Роля Статута 1566 года ў развіцці айчыннага канстытуцыяналізму і парламентарызму // Правотворчество и правоприменение как фактор эффективного развития современных экономических систем : сб. науч. ст. / ГрГУ им. Я.Купалы ; редкол. С.Е.Чебуранова (гл.ред.) [и др.]. Гродно : ГрГУ, 2016. С.83-88; Доўнар Т.І. Права Беларусі: ад Судзебніка 1468 года да Статута 1529 года // Юстыцыя Беларусі. 2019, № 5. С.74-77. і інш.

3. Доўнар Т.І. Асаблівасці і праблемы гісторыі дзяржавы і права Беларусі // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 4. Правазнаўства. 2012. № 2 (128) . С. 33-38; Доўнар Т.І. Гісторыка-прававая навука ў Беларускім дзяржаўным універсітэце // Традиции университета: ад Франциска Скорины до современности : сб. материалов Междунар. науч. конф., Минск 26-27 окт. 2017 г. / редкол. : С.Н. Ходин [и др.]. Минск : Изд. центр БГУ, 2017. С.77-82; Довнар Т.И. Становление и развитие историко-правовой науки Беларуси // Тенденции развития права в социокультурном пространстве. Жидковские чтения = Tendencies of development of law in sociocultural space. Zhidkov's readings : материалы Всероссийской научной конференции. М., 24–25 марта 2017 г. / отв. ред. М. В. Немытина. М. : РУДН, 2018. С. 450–459 і інш.

4. Доўнар Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : падручнік. Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2014. 438 с.